# Аб дружбе кнігі гавораць

Унікальны альбом партрэтаў удзельнікаў вайны 1877—1878 года экспануецца на кніжнай выстаўцы, якая адкрылася ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна. Ён быў выдадзены ў Пецярбургу праз год пасля вызваленчага паходу. У ім больш чым сто рэпрадукцый мастацкіх партрэтаў рускіх палкаводцаў і афіцэраў — удзельнікаў руска - турэцкай вайны. Сярод іх праслаўленыя генералы Міхаіл Скобелеў, Уладзімір Дабравольскі, Антон Раух, Фёдар Радзецкі і іншыя, чые імёны і сёння помніць і ўшаноўвае ўдзячная Балгарыя.

Выстаўка прымеркавана да 100-годдзя вызвалення балгарскага народа ад асманскага ярма і ўключае выданні, якія расказваюць аб традыцыйнай дружбе і супрацоўніцтве нашых народаў - пабрацімаў.

Шырока прадстаўлены ў экспазіцыі творы балгарскіх і беларускіх літаратараў, творчыя сувязі якіх вылічваюцца многімі дзесяцігоддзямі. У ёй кнігі Івана Вазава, Хрыста Боцева, Людміла Стаянава, Атанаса Далчэва, Найдзена Вылчэва і іншых балгарскіх аўтараў у перакладзе на беларускую. А побач—творы Я. Коласа, Я. Купалы, П. Броўкі, І. Мележа, В. Быкава, А. Адамовіча, іншых беларускіх пісьменнікаў на балгарскай мове.

(БЕЛТА).